УДК 821.161.3.09

**Кузьміч Н. В.**,
кандыдат філалагічных навук,
Беларускі дзяржаўны універсітэт
(Мінск, Беларусь)

# ЭНТАГЕНЕЗ МЕНТАЛЬНАСЦІ: МАСТАЦКІ АСПЕКТ

У мастацкім творы побач з тэмамі вечнымі (універсальнымі) і нацыянальна-гістарычнымі абавязкова знаходзіць свае выражэнне індывідуальны вопыт самога аўтара. Маральна-эстэтычныя пазіцыі (каштоўнасныя арыентацыі) персанажаў маюць сваёй асновай рэальныя жыццёвыя праграмы, а могуць быць і інтуітыўнымі, абумоўленымі натурай пісьменніка і культурнай традыцыяй, што існуе ў пэўным сацыяльным асяродку. Таму можна сказаць, што мастацкі вобраз у літаратурным творы дае ўяўленне пра духоўны (а разам і маральны) свет пісьменніка і яго сучасніка. Такім чынам, у літаратуры, несумненна, знаходзіць выяўленне індывідуальны сацыяльна-практычны вопыт творцы і асаблівасці менталітэту народа.

Асаблівасці менталітэту беларускага народа часткова закраналіся некаторымі даследчыкамі (напрыклад, Л. Тарасюк, інш.) у сувязі з разглядам творчасці пэўнага пісьменніка. У дадзеным матэрыяле ўпершыню зроблена спроба выявіць асаблівасці адлюстравання спецыфікі менталітэту беларускага народа ў празаічных творах, а менавіта апавяданнях, некаторых беларускіх пісьменнікаў.

Гістарычна склалася так, што сваю літаратуру ў пісьмовай форме на роднай мове беларусы атрымалі ў канцы ХІХ – пачатку ХХ стагоддзяў; беларускай мовы як дзяржаўнай у тыя часы яны наогул не мелі. Практычна літаратура функцыянавала ў фальклорнай тэматыцы, якая, дарэчы, дала нямала выдатных твораў (казак, легенд, паданняў), дзе адлюстраваны самабытны характар і светабачанне беларусаў, найперш – з сялянскага асяроддзя. Толькі са з'яўленнем твораў Францішка Багушэвіча (“Тралялёначка”, “Сведка”, “Палясоўшчык”, “Дзядзіна”), Каруся Каганца (“Што кажух, то не вата”, “На сплаў”, “Бывалы Юр у Менску”), Ядвігіна Ш. (“Бярозка”, “Жывы нябожчык”, “Чортава ласка”, “Заморскі звер”) у беларускай літаратуры азначыўся герой, які з дапамогай мастацкіх сродкаў увабраў у сабе некаторыя адметныя рысы беларускай ментальнасці; хаця можна ўзгадаць, што трохі раней рускі паэт-дэмакрат Мікалай Някрасаў у паэме “Чыгунка” ўжо намаляваў своеасаблівы партрэт беларуса і падкрэсліваў “привычку к труду благородную” і тое, як “трудно свой хлеб добывал человек”:

*Не разогнул свою спину горбатую*
*Он и теперь ещё: тупо молчит*
*И механически ржавой лопатою*
*Мёрзлую землю долбит!* [2, 258].

Варта зазначыць, што ў апавяданнях згаданых беларускіх аўтараў яшчэ адчуваецца сувязь з фальклорнымі традыцыямі, але ўжо з'яўляецца герой, створаны сістэмай мастацкіх сродкаў, надзелены індывідуальным вострым

мысленнем і дасціпным розумам, які хоча спазнаць сябе і сваё месца ў плыні грамадскіх і сацыяльных з'яў і праблем. У сюжэтна-кампазіцыйную структуру твораў уводзяцца аўтарскія адступленні і дыялогі, пейзажныя замалёўкі і мастацкая ўмоўнасць. У выніку ствараецца ў пэўнай меры паўнацэнны герой, які нясе на сабе адзнакі часу, у тым ліку ў сваім менталітэце, зрэз якога – дапытлівасць і асцярожнасць, імкненне самому спазнаць сябе і адстаяць свой гонар. Варта адзначыць, што такая інтэнцыя беларуса выразна акрэслілася ў беларускай мастацкай літаратуры ва ўмовах нацыянальнай і сацыяльнай прыгнечанасці ў Расійскай імперыі.

Адметным этапам у фарміраванні нацыянальнай ментальнасці беларуса мастацкімі сродкамі літаратуры стала творчасць аднаго з класікаў беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага (1893–1938). Ён, як ніхто іншы да яго, здолеў глыбока, па-філасофску аналітычна пранікнуць ва ўнутраны свет беларуса, выявіць яго сувязі і адносіны з сусветам, залежнасць ад грамадскага і сацыяльна-культурнага асяроддзя, урэшце – ад узроўню дасведчанасці ў некаторых галінах ведаў. Напрыклад, у апавяданні "У лазні", дзе сюжэт даволі просты – казённага стыпендыята каморніцкага вучылішча Кліма Шамоўскага, які прыехаў на канікулы да родных, маці адпраўляе перад святам у лазню памыцца з вясковымі мужыкамі. Тут – праз дыялогі і гутаркі, шчырыя і нязмушаныя, – адкрылася душа беларуса; у ёй яшчэ шмат побытавага бруду, і беларус яшчэ верыць у замовы, у паданні і чараўніцтва, але ўжо ёсць у асяроддзі мужыкоў такі інтэлігент, як Клім Шамоўскі, які бачыць, што трэба вызваляць беларуса ад невуцтва і побытавай неўладкаванасці, ачысціць яго свядомасць ад забабонаў. Клім "не чураецца вёскі, любіць яе і шануе, як родны сын, што ён хоча кіравацца усімі сіламі, каб бачыць яе цвярозай, светлай, задаволенай жыццём ды сумленнай" [5, 51]. Побач з Клімам Шамоўскім – па імкненні змяніць склад розуму і мысленне землякоў праз авалоданне навукай і самапазнанне – стаіць студэнт-медык Архіп Лінкевіч (апавяданне "Роднае карэнне"), які спецыяльна едзе ў вёску да бацькоў, каб пераканаць, што няма ніякай таямніцы ў прыродзе, што яе з'явы падуладныя чалавеку. У асобе Архіпа, маладога студэнта, выведзены новы тып беларуса, які імкнецца пазнаць навакольны свет з пазіцый навукі; ён хоча лепш ведаць самога чалавека, каб разумна фарміраваць яго грамадскія і сацыяльныя інтарэсы і патрэбы. Архіп падымаецца ў сваіх наглядannях да цікавых вывадаў і абагульненняў: беларус разважлівы і разумны, працавіты і практычны, ён любіць сваю зямлю, але яму не стае ведаў, каб змяніць сваё жыццё да лепшага. Падчас роздуму аб лёсе беларуса герой твора марыць: "Пайсці і сілу сваю на ўвесь свет паказаць, прагнаць крыўдзіцеляў, вытурыць іх ад людзей бедных, шчырых, змірных і пакорліва-прыязючых, людзей родных і балюча скрыўджаных" [5, 68]. Сваімі персанажамі Максім Гарэцкі сцвярджае тып беларуса, які імкнецца падняцца над брудам вясковай сацыяльна-побытавай стыхіі; у яго праяўляецца новае мысленне і погляд на рэчаіснасць. Пераадольваецца прымітыўна-вузкае ўяўленне пра беларуса, найперш сялянскага паходжання, паводле вобразнага выразу класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы, "пана сахі і касы", які толькі

ўмее абрабляць зямлю. У сваім новым абліччы ён ішоў на змену правінцыяльшчыне ў поглядах і грамадска-сацыяльнай абмежаванасці; гэта ўжо малады інтэлігентны чалавек, які ў горадзе спазнае вялікую сілу навукі і духоўную моц чалавека, упартага ў дасягненні сваіх мэтаў. Такому беларусу ўжо недастаткова быць староннім наглядальнікам працэсаў, што адбываюцца ў асяроддзі землякоў; ён хоча далучыць іх да цывілізацыі, дзе няма месца забабонам, сацыяльнага і духоўнага ўбоства.

Асабліва ярка і выразна вобраз беларуса, які імкнецца вырвацца з сацыяльнай цемры і невуцтва, каб адчуць сябе чалавекам, выведзены ў апавяданні “Стогны душы”. Каб узмацніць мастацкае ўздзеянне твора, аўтар сам выступае ў ролі апавядальніка. Тут адлюстравана своеасаблівая рэфлексія: апавядальнік у глыбокім роздуме над сваім грамадскім становішчам; ён заяўляе: “Я жыць хачу вольным жыццём...” [5, 58]. Тут выказваецца пратэст супраць усяго, што прыніжае годнасць чалавека: “Я скіну, сарву ланцугі свайго старога жыцця і зраблю жыццё новае” [5, 58]. Рэфлексіі ў апавяданні філасофска-аналітычнага зместу. Каб пазбегнуць дэкларатыўнасці, якая зніжае мастацкую вартасць любога твора, пісьменнік падае дзеянне на фоне карціны рэальнага жыцця: нават чутно, як шуміць у дрэвах вецер, праз які аўтар метафарай звязвае чытача з разнастайнымі праявамі рэчаіснасці.

Такім чынам, Максім Гарэцкі адным з першых у беларускай літаратуры ХХ стагоддзя адкрыў новага героя, які імкнецца на аснове ведаў стаць упоравень з павевамі часу, дасягненнямі сучаснай навукі і культуры. Безумоўна, працэс выспявання такой ментальнасці зусім не гладкі, што пацвярджаецца вобразамі і Кліма Шамоўскага, і Архіпа Лінкевіча, і аўтара-апавядальніка, але ён незваротны. У грамадстве з дапамогай літаратурных вобразаў фарміравалася ў беларусаў новае мысленне і адносіны да сябе на аснове разумення тых сацыяльных і духоўных каштоўнасцей, якія ўзвышаюць чалавека.

У сілу шэрагу прычын, у першую чаргу геапалітычных, у беларуса сфарміравалася ўстойлівая прывязанасць да свайго дома, да роднай зямлі. Узгадаем, што ў мінулыя стагоддзі над беларускім краем пранасіліся спусташальныя войны, якія руйнавалі паселішчы, разбуралі звыклы уклад жыцця, масава забіралі людскія жыцці. Але беларус зноў і зноў аднаўляў сваё жыллё. Заканамерна, што ў беларускай літаратуры вобраз чалавека, які адраджае сваю хату, перарастае ў пэўнай ступені ў сімвал ментальнасці. Яшчэ ў XVI стагоддзі Францыск Скарына, ураджэнец Полаччыны, які жыў у Празе, у мастацкай форме дакладна вывеў агульначалавечы менталітэт. Але ён, безумоўна, меў на ўвазе беларуса, якога ведаў лепш, чым іншыя народы: “Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя; птици, летающие по возъдуху, ведають гнёзда своя; рибы, плывающие по морю и в реках, чують виры своя; пчёлы и тым подобная боронять ульев своих, – тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе, к тому месту великую ласку имають” (“Предословие доктора Францыска Скорины с Полоцька в книги Иудиф-Вдовици”) [6, 94].

Па-мастацку ўвасоблены вобраз беларуса, які пасля жыццёвых віхур і нягод будуе новае жыллё, ёсць у многіх творах сучаснай літаратуры, у тым ліку так званай “малой” формы. Напрыклад, апавяданні пад адной назвай – “Новая хата” – належаць пяру трох вядомых беларускіх пісьменнікаў Івана Навуменкі, Янкі Сіпакова, Барыса Сачанкі. У кожнага з аўтараў індывідуальная стылявая манера, свой набор выяўленчых сродкаў, свае эстэтычныя арыентацыі. Але адно тут галоўнае – вобраз чалавека, які, прайшоўшы жыццёвыя выпрабаванні, будуе сваю хату насуперак цяжкасцям і нягодам.

У апавяданні Івана Навуменкі аўтар і апавядальнік у адной асобе. Ад яго імя разгортваецца сюжэтнае дзеянне, з яго пункту гледжання ацэньваюцца падзеі. Магчыма, яму, падлетку, не хапае вопыту, каб да канца зразумець бацьку, які часта злуецца, бо не ўсё атрымліваецца, каб пабудаваць новае прыстойнае жыллё. Дапамагаюць суседзі і проста знаёмыя людзі. Ён, падлетак, засвойвае першыя сталыя ўрокі жыцця; ён глыбока перажывае, калі бацька сварыцца з маці, па-сапраўднаму зведвае радасць, калі ладзяцца ўваходзіны: “Новая хата, калі ў ёй наслалі падлогу, зляпілі печ і ўставілі вокны, была шырокая і светлая” [1, 281], – значыць, тут трывала і надоўга паселіцца шчасце. У апавяданні ёсць аўтарскія адступленні, у якіх паказаны спробы падлетка асэнсаваць складаныя праблемы чалавечых узаемаадносін; да месца ў кантэксце задумы лірычныя замалёўкі, якія ствараюць светлую танальнасць твора. Наогул уся паэтыка апавядання ўзвышае ўнутраны свет чалавека, які асталёўваў сваё жытло ў родным краі надоўга і з разлікам на шчасце.

У апавяданні Янкі Сіпакова, на першы погляд, крыху дзіўнаватая бабка Маланка, у якой складаны лёс. Але яна ўпарта цягнецца да светлага і чыстага ў жыцці, што ўвасоблена ў імкненні мець свой утульны куток у родным доме. Рана аўдавелая, бабка пасля вайны з дапамогай людзей узбілася на хату. Тут і дажывала свой век у адзіноце ў сялянскай працы. Але здарылася бяда – сярод белага дня згарэла хата. Гора, аднак, не сагнула бабку Маланку: хоць недалёка прасторная хата сына, які запрашае да сябе жыць, яна вырашае будаваць свой новы дом. Як піша аўтар, “хата атрымалася... яшчэ святлейшая за ранейшую – у ёй было болей святла” [4, 283].

У апавяданні Барыса Сачанкі сваё сюжэтна-кампазіцыйнае рашэнне. Галоўны герой – студэнт Змітро, які ўвосень прыехаў у роднае сяло. Ад яго імя ідзе апавяданне, але ён як бы наглядае за падзеямі збоку. Мастацкі прыём адстароненасці ўзмацняе эмацыйна-псіхалагічнае ўспрыманне дзеяння. У творы аўтар-апавядальнік, калі ў хату да яго завітала суседка Матруна Куксёнак, каб запрасіць на ўваходзіны, узгадвае, што яе муж, дзядзька Язэп, у свой час марыў пабудаваць новую хату, нават адкладваў на яе кожную лішнюю капейку. На жаль, пры жыцці не ўдалося. Новую хату ўзвёў сын Рыгор. Зыходзячы з мастацкай логікі апавядання, з маральна-этычнай задачы, якую вырашае пісьменнік, верыцца: гэта дом, поўны сонца і шчасця. У апавяданні кароткая дзея: цётка Матруна запрашае на ўлазіны ў новую хату, пабудаваную яе сынам Рыгорам. Але – у падтэкставай прасторы – цэлая канцэпцыя жыцця беларуса, які любіць сваю зямлю.

Такім чынам, можна зазначыць, што ў апавяданнях Івана Навуменкі, Янкі Сіпакова, Барыса Сачанкі, дзе выведзены вобраз беларуса, што насуперак цяжкасцям і перашкодам будуе сабе новы дом, дасягаецца мастацкае абагульненне, у якім выразна прасочваецца адна з вызначальных рыс ментальнасці беларускага народа – любоў да сваёй зямлі, да роднага краю. Гэта не проста імкненне да аселасці, тут значна глыбейшы сацыяльна-духоўны змест. Жыць на сваёй зямлі – у гэтым сапраўднае шчасце; як і памерці ў сваёй хаце. Таму ў пэўнай меры сімвалічна заканчваецца апавяданне Янкі Сіпакова “Новая хата”: “...яна (Маланка. – *Н. К.*) ляжала ў труне спакойная, нават шчаслівая і быццам бы ўсміхалася: вялікая мэта яе жыцця была дасягнута – на высокім падмурку стаяла прыгожая, як лялька, хата. Светлая і прасторная, яна была якраз такою, якою і хацела яе бачыць Маланка” [4, 284].

Таксама можна сцвярджаць, што ў беларускай літаратуры асабліва ярка і маштабна выведзен вобраз змагара за сваю зямлю, за родны дом. Лёс прымусіў беларуса ясна ўсведамляць: мала збудаваць жыллё для сябе і сям’і, – трэба бараніць яго ад ворага, а значыць – бараніць сваю краіну. Такі спосаб мыслення і дзеянняў беларусаў у цяжкія часы выпрабаванняў у поўнай меры праявіўся падчас Вялікай Айчыннай вайны. Тады, як вынікае з апавяданняў класіка беларускай літаратуры Кузьмы Чорнага (1900–1944), на барацьбу падняўся ўвесь народ. Масавасць барацьбы падкрэсліваецца тым, што сапраўднымі героямі сталі простыя людзі, якія ў мірны час не выдавалі з сябе адметных асоб. Напрыклад, Пархвен Катлубовіч, герой апавядання “Вялікае сэрца”, які праславіўся тым, што біўся з п’яным пеўнем, якога на вясковым вяселлі сілком падпаілі падлеткі. На першы погляд, чалавек крыху дзіўнаваты, Пархвен знайшоў у сабе велізарны запас духоўных сіл, каб не скарыцца ворагу. Спачатку спакойнае і адладжанае жыццё да вайны цякло ў Пархвена. Рана аўдавелы, ён адзін спраўляўся па гаспадарцы, гадаваў дачку Марылю. Аўтар апавядання дакладна абмалёўвае кола клопатаў і памкненняў Пархвена: “...быў задаволен тым, што было ў яго: была смешная слава, была хата, пры ёй двор і агарод, у агародзе прадзедаўскі дуб напроці хатніх вокнаў і жыццё – ціхае і роўнае, у цягавітай працы ад усходу сонца да заходу і з панядзелка да панядзелка” [7, 308]. Яго інтарэсы не сягалі далей межаў мястэчка; ён радаваўся, што на сядзібе расце дуб, які ўзвышаўся над наваколлем, што ў яго верхаллі вечарам заўсёды садзіцца сонца... Дарэчы, вобразы дуба і сонца скразныя. У іх выяўлена адна з вызначальных рыс ментальнасці беларусаў – імкненне не залежаць ні ад каго б тое ні было. Сімвалічна, што дуб фашысты не маглі ні спілаваць, ні спаліць, ні ссекчы па частках, – на абгарэлай кроне падняўся малады парастак. Нават у самыя трагічныя моманты, калі немцы сабралі жыхароў мястэчка, каб выявіць, хто забіў яго новага гаспадара Пфайфеля, – у абсмаленых галінах дуба паказалася сонца. Пяшчотнай душы чалавек, які ніколі не пакрыўдзіў нічога жывога, але нязломны ў сваёй нянавісці да чужынцаў, што прыйшлі ў яго хату з мячом, – Пархвен, каб выратаваць ад расстрэлу вяскоўцаў, узяў на сябе віну за забойства Пфайфеля, якому рассекла

чэрап у парыве гневу дачка Пархвена Марыля. Пархвен быў гатовым загінуць дзеля таго, каб зелянеў на падворку дуб, каб у яго голлі садзілася вечарам сонца, каб у яго хаце жыла дачка Марыля са сваім маленькім сынам...

Такі ж просты ў сваёй жыццёвай філасофіі і прыгожы ў сваёй любові да роднага краю Банадысь Татарынчык, герой апавядання "Прасторны дом". У сялянскай працы прайшло яго жыццё. Самая вялікая ўцеха і радасць героя твора – гэта шасцёра дарослых дзяцей. Для іх, каб збіраліся разам з бацькамі, паставіў побач са старым новы светлы і ўтульны дом, у якім шмат сонца. Калі было наваселле, ён, крыху падпіўшы ў кампаніі, казаў, што дом з моцнай дзеравіны і переражыве яго. Трагедыя ўварвалася ў дом нечакана: тут спыніўся атрад фашыстаў. Яны наводзілі свае парадкі, сеялі смерць і разбурэнне. Што рабіць? Банадысь прымае рашэнне: як ні шкада дом, збудаваны на шчасце дзяцей, спаліць яго разам з ворагам. Абхітрыўшы нямецкага афіцэра, ён у зручны момант, калі фашысты клаліся на начлег, усунуў падпалены куль саломы пад страху; агонь, які шугануў у начное неба, усцешыў яго душу: у ім гарэў ненавісны вораг.

Яшчэ адно з самых яркіх апавяданняў, у якім выяўляецца менталітэт беларуса-змагара, называецца "Маленькая жанчына". Тут дасягаецца абагульненне, у якім намаляваны цэласны вобраз Беларусі: дванаццацігадовая дзяўчынка ў натоўпе бежанцаў, гнаных вайной, пад фашысцкай бамбёжкай вядзе на ўсход выпадкова сустрэтых двух дзетак. Роў самалётаў, выбухі, крыкі скалечаных людзей, але дзяўчынка, прыкрыўшы сваіх спадарожнікаў кволым целам, упарта імкнецца на ўсход – там сонца, там павінна быць воля. Аўтар не дае імя сваёй гераіні, тым самым ён падкрэслівае, што такія ў беларускім народзе ўсе; іх не зламае ніякі вораг. Сонца абавязкова падымецца на ўсходзе, яно прынясе – няхай не сёння ці заўтра, бо шлях наперадзе пад бомбамі – збавенне ад пакут і смерці.

Працэс глабалізацыі, які прыняў усеагульныя маштабы, выклікаў у беларускай літаратуры вобраз героя, у якога ментальнасць, захоўваючы традыцыйныя рысы, трансфармуецца рэаліямі часу; у ёй усё выразней адчуваецца сувязь з сусветнымі тэндэнцыямі ў розных сферах жыцця, у прыватнасці з базавымі духоўна-грамадскімі каштоўнасцямі, выпрацаванымі чалавецтвам. Напрыклад, на покліч часу, нават у нечым апярэджваючы яго, адгукнуўся сваімі апошнімі апавяданнямі Васіль Быкаў. Нейкія з'явы яшчэ толькі ўгадваюцца, яшчэ не сталі фактам грамадскай свядомасці, як ён спрабуе асэнсаваць у мастацкай форме, даць ім грамадскае гучанне. Напрыклад, у такім філасофска-эстэтычным ключы напісана апавяданне "Музыка", што мае яўныя прыкметы прытчы. Дарэчы, і герой гэтага твора паўстае ў іншай іпастасці – гэта ўжо прафесійны музыкант, які прыехаў на далёкі востраў у экзатычнай краіне, каб даць творчыя канцэрты. З гатэля, дзе спыніўся, ён бачыць усю прыгажосць тутэйшай мясцовасці. Раптам чуе музыку. Яна пераносіць яго ў палёт. Узнікае дзіўны сон, у якім наслойваюцца адна на адну розныя з'явы, якія ствараюць ірэальнасць таго, што адбываецца. Нарастаюць гукі незразумелай музыкі. Яна ад рэквіема падымаецца да магутнага харала. Герой твора не можа разабрацца: адкуль музыка? Незнаёмы голас з-пад зямлі адказаў, што гэта хаваюць народ...

Як бачна, пісьменнік чуйна рэагуе на грамадска-палітычную рэальнасць дзеяннямі свайго героя, які адчувае: беларусы могуць страціць сваю нацыянальную ідэнтычнасць, арыентуючыся на чужыя духоўныя каштоўнасці, у першую чаргу на мову. Не сакрэт, што беларуская мова ў цяперашні час выцясняецца з ужытку практычна з усіх сфер жыцця. Яна занядбана самімі беларусамі. Такая сітуацыя балюча закранае многіх у краіне: знікне мова – знікне народ; абарвецца адзін з асноўных каналаў сувязі з сусветным працэсам, у якім праз мову беларус мае сваю адметнасць. Аналітычна-філасофскі вобраз героя выведзены ў апавяданні Васіля Быкава “Сцяна”. Уяўляецца, што пісьменнік знарок не дае герою імя, не надзяляе яго адметнай знешнасцю, каб падкрэсліць: гэта ўніверсальная агульначалавечая каштоўнасць – імкненне да волі. Герой у турэмнай камеры, не вядома за што асуджаны, паволі робіць сабе пралазу ў сцяне, каб вырвацца на свабоду. У руках адзін інструмент, які хавае ад наглядчыка, – маленькі каменчык. Драпіна да драпіны наносяцца на сцяну. Гэта страшэнна цяжка, марудна і небяспечна. Аўтар своеасабліва вырашае творчую задачу: у апавяданні шмат дзеяслоўных канструкцый, – сказы кароткія, яны дакладна перадаюць дынаміку дзеянняў, эмацыянальна-псіхалагічны стан героя. Нарэшце пралаз гатовы. Здаецца, мара пра волю збываецца. Але на двары турмы герой бачыць шыбеніцу, – як кажуць, кола замкнулася, бо ва ўмовах таталітарных рэжымаў чалавек не можа быць свабодны.

Такім чынам, можна пазначыць, што беларуская літаратура ў сілу спецыфікі свайго зараджэння ў пачатку XX стагоддзя ва ўмовах Расійскай імперыі адразу стала галоўным выказнікам настрояў і памкненняў свайго народа, найперш у апавяданні як мабільным жанры, якому ў большай ступені ўласцівы дынамізм у развіцці. Адразу выявілася тэндэнцыя – паказаць беларуса як асобу, здольную да пратэсту супраць свайго бядотнага становішча. Напрыклад, герой апавяданняў Максіма Гарэцкага асэнсоўвае сябе і свае адносіны да свету для таго, каб лепш зразумець, якім чынам дабіцца лепшага лёсу. Таксама ў беларускім апавяданні з усёй паўнатой раскрыты вобраз чалавека, які любіць сваю зямлю, дбае пра яе росквіт, але заўсёды гатовы любой цаной абараніць ад ворага. Нарэшце у сучасным апавяданні, найперш у творах Васіля Быкава, ментальнасць беларуса выяўляецца ў разуменні і гатоўнасці абараняць такія каштоўнасці, як свабода асобы і нацыянальная самаідэнтыфікацыя.

**Літаратура**

1. Навуменка І. Падарожжа ў юнацтва : выбранае / І. Навуменка. – Мн. : Мастацкая літаратура, 1972. – 434 с.
2. Некрасов Н. А. Сочинения : [в 2 т.] / Н. А. Некрасов. – М. : Худож. лит., 1976. – Т. 1 : стихотворения 1845–1877.
3. Сачанка Б. Выбраныя творы : [у 2 т.] / Б. Сачанка ; [аўт. прадм. С. Андраюк]. – Мн. : Маст. літ., 1981. – Т. 1 : апавяданні ; аповесці. – 638 с.
4. Сіпакоў І. Д. Двое на вуліцы : выбранае / І. Д. Сіпакоў ; [уклад. В. Шніпа]. – Мн. : Маст. літ., 2011. – 534 с.
5. Сучасная беларуская проза : традыцыі і наватарства / [уклад. Ул. Сіўчыкава, М. Тычыны]. – Мн. : Сэр-Віт, 2003. – 704 с.

6. Францыск Скарына і яго час : [энцыкл. давед.] // Беларус. Сав. Энцыклапедыя / [рэдкал. І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш.]. – Мн. : БелСЭ, 1988. – 608 с.
7. Чорны К. Вераснёвыя ночы : [апавяданні, раман] / К. Чорны ; [уклад. Т. Грамадчанкі, А. Гурскай]. – Мн. : Маст. літ., 2003. – 429 с.

**Анотація**

У статті зроблена спроба виявить основні особливості показу формування специфіки менталітету білоруського народу в творах білоруської літератури. Схарактеризовані основні моменти в еволюції національної ментальності народу, от вимкнення к знанням до вимкнення кметь свою хату и оборонять її, як и оборонять свою країну, свою культуру. Особливості показу в художньої літератури національної ментальності народу досліджуються на прикладе оповіданнів знакомитих білоруських письменників.

**Ключові слова:** менталітети, національна ментальність, білорус, оповіданне, художні особливості.

**Аннотация**

В данной статье впервые предпринята попытка выявить особенности показа специфики менталитета белорусского народа в рассказах некоторых белорусских писателей. В материале анализируются предполагаемые возможные этапы формирования ментальности народа, от стремления к знаниям и рефлексии до стремления иметь свой дом и защищать его, как и защищать свою страну, свою культуру. Особенности отображения в литературных произведениях ментальности народа рассмотрены на примерах рассказов классиков литературы.

**Ключевые слова:** менталитет, национальная ментальность, беларус, рассказ, художественные особенности.

**Summary**

The article analyses the same peculiarities of the forming of Belarusian mentality for example of Belarusian writer's novels. For the first time a special research of particulates evolution of the Belarusian mentality has made with the context of Belarusian prose. In these writer's novels Belarusian is thoughtful and intelligent, laborous and down to earth, he likes his earth, he builds his own house, loves his land and takes care of her flourishing but is always ready to defend it from enemy at any cost is fully disclosed in Belarusian story. Belarusian mentality is shown in understanding and readiness to defend such values as individual freedom and national self identification.

**Keywords:** mental structure, national mentality, Belarus, novel, the artistic solving.

УДК 81'367.623

**Микитюк О. Р.**,
кандидат філологічних наук,
Національний університет
"Львівська політехніка"

## УКРАЇНСЬКИЙ ПРИКМЕТНИК ЯК СТРИЖЕНЬ НАЦІОНАЛЬНОЇ КАРТИНИ

Український прикметник – це найкоштовніша оздоба нашого мовлення. Будь-яка реалія, уточнена прикметником, набуває неймовірно точних та доречних відтінків, наприклад, українські прислів'я та приказки рясніють прикметниками: *лучче з* ***розумним*** *два рази загубити, як з* ***дурним*** *раз знайти;* ***батьків*** *хліб не навчить;* ***покірна*** *вівця для вовків* ***наймиліша****; з* ***чужого*** *вола посеред дороги злазь*.